пу беларуса, вольнага ад сервілізму і нацыянальнага дэкадансу, свядомага ідэалаў 25 сакавіка» (25.3.1918 была абвешчана незалежнасць Бел. Нар. Рэспублікі). Часопіс прапагандаваў ідэю суверэннасці Беларусі, арыентаваў чытачоў у тагачасных паліт. плынях, выкрываў фашызм, крытыкаваў практыку сацыяліст. будаўніцтва ў СССР, надаваў увагу праблемам духоўнага жыцця народа і ролі нар. культуры ў сучаснасці, высвятленню прычын рэліг. індыферэнтызму сярод моладзі, пытанням маральна-этычнага характару. Асвятляў падзеі ў культ. і грамадскім жыцці Зах. Беларусі і Вільні. Выйшла 5 нумароў.

**ДВОР**, 1) участак зямлі пры доме, хаце, прадпрыемстве, установе, кампазіцыйна і функцыянальна звязаны з будынкамі, абгароджаны плотам або сценамі пабудоў; тое, што і сядзіба ў сельскай гаспадарцы. Можа быць падзелены на асобныя часткі, якія прызначаюцца для рэалізацыі пэўных функцый (парадны двор і інш.). 2) Гасп. двор — частка буйной гаспадаркі ці прадпрыемства, спецыяльна сфарміраваная для размяшчэння адпаведных пабудоў і выканання вытворча-гасп. дзейнасці: двор для жывёл (хлявы, стайні, аборы і інш.), машынны двор (гаражы, майстэрні, склады і інш.) і інш. 3) Тып сельскага паселішча, цэнтр. сядзіба феадальнай гаспадаркі (маёнтка, фальварка), дзе жыў феадал ці размяшчалася яго адміністрацыя. Спецыфіка паселішча часам замацоўвалася ў яго назве (Двор Порплішча ў Докшыцкім, Двор Нізгалава ў Бешанковіцкім р-нах і інш.). *С.А.Сергачоў.*

**ДВОРЫШЧА**, вёска ў Лідскім р-не, на р. Жыжма. За 15 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Ліда, 125 км ад Гродна, каля аўтадарогі Ліда—Ашмяны. Цэнтр Дварышчанскага с/с. 222 гаспадаркі, 627 ж. (2011).

У 2-й пал. 19 ст. маёнтак у Жырмунскай воласці Лідскага павета Віленскай губ. У 1886 — касцёл, вінакурны і піваварны заводы, карчма, млын. У 1909 — 92 ж. З 1919 вёска ў БССР. З 1921 у Польшчы, у Жырмунскай гміне Лідскага павета Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР. З 15.1.1940 у Лідскім р-не Баранавіцкай вобл. У Вял. Айч. вайну з канца чэрв. 1941 да пач. ліп. 1944 Д. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. З 20.9.1944 у Гродзенскай вобл. З 11.1.1966 цэнтр сельсавета. У 1971 — 78 гаспадарак, 263 ж. У 1997 — 170 гаспадарак, 546 ж.

У 2011 вучэбна-пед. комплекс сярэдняя школа—сад, Дом культуры, б-ка, ФАП, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі, магазін.

**ДВУВЕ́РШ**, гл. *Элегічны двуверш.*

**ДВУРЫМ**, рыфмаваны верш або фрагмент верша, паэмы, у якім праз увесь тэкст ужываюцца ўсяго 2 рыфмы. У тэксце могуць рыфмавацца 2 аднолькавыя словы, як у гутарцы «Размова аднаго мітрапаліты з празбітарам, каторы се называў шатан, а быў пратапопам слонімскім» 18 ст., што прыпісваецца Д.Рудніцкаму:

— Чалом, чалом, шатане.
— Слава, вашмосці, міласцівы пане.
— Гдзе ж ты ездзіў, шатане?
— Па попах, міласцівы пане.
— Шчо ж ты чыніў, шатане?
— Грошы збіраў, міласцівы пане.
— Чы не крыўдзіш ты каго, шатане?
— Табе нічога да тога, міласцівы пане.

У якасці рыфмаў могуць выкарыстоўвацца розныя словы («Размова ў адным замежным рэстаране Н.Гілевіча).

Належны эфект, часта камічны, дасягаецца ў Д. толькі пры дастаткова вял. працягласці тэксту. *Ю.В.Пацюпа.*

**ДВУХАСНО́ЎНАЕ ТКАЦТВА**, тэхніка народнага ткацтва; тое, што і *падвойнае ткацтва.*

**ДВУХМОЎЕ**, б і л і н г в і з м, практыка індывідуальнага або калектыўнага выкарыстання 2 моў у межах адной дзярж. або сац. супольнасці ў залежнасці ад канкрэтнай камунікатыўнай сітуацыі. Асвятляецца ў розных аспектах: лінгв., сацыялагічным, дыдактычным, псіхалаг., культуралагічным, гіст. і інш. Пашыраны ў поліінац. краінах і ўздоўж этнічных межаў. Д. існуе таксама ў краінах (найчасцей былых калоніях), дзе дзярж. статус атрымлівае мова, якая выкарыстоўваецца ў якасці сродку міжнац. зносін. Адрозніваюць Д. каардынатыўнае (свабоднае валоданне 2 мовамі) і субардынатыўнае (змешванне ў маўленні элементаў 2 моў; інтэрферэнцыя), індывід. (2 мовамі валодаюць толькі асобныя члены грамадства), групавое (білінгвальнымі з'яўляюцца цэлыя калектывы) і нац. (характэрны для ўсёй нацыі). Паводле ўзросту, у якім адбываецца засваенне другой мовы, адрозніваюць Д. ранняе і позняе. Вылучаюць таксама Д. рэцэптыўнае (успрымальнае), рэпрадуктыўнае (узнаўляльнае) і прадуктыўнае (утваральнае), апошняе з якіх з'яўляецца мэтай вывучэння замежнай мовы. У Беларусі найб. пашырана бел.-рус. Д., звязанае з ужываннем жыхарамі побач з бел. мовай рус. У адпаведнасці з вынікамі перапісу насельніцтва 2009, з 9 503 807 рэспандэнтаў у якасці роднай мовы ўказалі бел. 5 058 402 чал., рус. — 3 948 074. Другой мовай, якой свабодна валодаюць, 1 281 720 чал. назвалі бел., 1 305 431 — рус. Інш. формы Д. ў Беларусі звязаны з выкарыстаннем побач з бел. і рус. літоўскай, польск., укр., лагышскай і інш. моў.

*Літ.:* Г и р у ц к и й А.А. Белорусско-русский художественный билингвизм: типология и история, языковые процессы. Минск, 1990; Типология двуязычия и многоязычия в Беларуси. Минск, 1999; Двуязычие в Беларуси. Минск, 2011.

*Д.В.Дзятко.*

**ДВУХМО́ЎНЫ СЛО́ЎНІК**, даведачнае выданне, якое (разам са шматмоўным слоўнікам, двух- і шматмоўным размоўнікамі) адносіцца да тыпу перакладных слоўнікаў. У Д.с. змест рэестравых адзінак (слоў, словазлучэнняў, сказаў і г.д.) адной мовы перадаецца сродкамі інш. мовы. Часцей за ўсё гэта робіцца шляхам перакладу,